**Фокіна І.С.**
БДАТУ (Мінск)

# ВУСНАЕ ВЫКАЗВАННЕ ЯК ФОРМА РАБОТЫ ПА РАЗВІЦЦЮ МАЎЛЕННЯ СТУДЭНТАЎ

Праблема развіцця маўлення набывае ў наш час усе большую грамадскую значнасць, таму што правільнае, прыгожае, аргументаванае маўленне з'яўляецца паказчыкам не толькі культуры маўлення, але і важным паказчыкам духоўнага развіцця асобы. Грамадству неабходны людзі, якія валодаюць словам, умеюць абараніць свае перакананні, погляды, творча ўключыцца ў працэс міжасобаснай камунікацыі.

Само паняцце развіцця маўлення выступае на сенняшні дзень як у навукова-метадычным, так і ў філасофска-псіхалагічным значэннях. Працэс авалодання маўленнем ідзе праз усе жыццё: ен непасрэдна звязаны з духоўным станаўленнем асобы, з узбагачэннем яе ўнутранага свету. Інтэнсіўнае развіццё маўлення пачынаецца яшчэ пад час навучання ў школе пры вывучэнні літаратуры і мовы і працягваецца ў ВНУ.

У такога роду навучальнай працы развіваюцца творчыя здольнасці, студэнты разумеюць практычную накіраванасць сваей дзейнасці, а таксама ацэньваюць уласныя магчымасці, што павышае зацікаўленасць у выніках. Такім чынам фарміруюцца свядомыя адносіны да інтэлектуальнай працы.

Вусная мова развіваецца праз:

- ***слуханне*** — гэта ўзорнае слова выкладчыка, лекцыя, абмеркаванне вусных паведамленняў аднагрупнікаў;

- ***чытанне*** — гэта чытанне тэкстаў літаратурных твораў, крытычных і іншых матэрыялаў, выразнае чытанне;

- ***назіранне*** — праца над мовай твора, тэкста, лінгвістычны аналіз;

- ***выступленне*** — расказванне, пераказы, адказы на пытанні, разгорнутыя маналагічныя выказванні, выступленні з рэфератамі і дакладамі.

Ва ўніверсітэце развіццё маўлення на занятках па дысцыпліне “Беларуская мова. Прафесійная лексіка” адбываецца ў форме вуснага выказвання. У пачатку семестра студэнтам прапануецца прыкладны пералік тэм для вусных выказванняў і спіс літаратуры для іх падрыхтоўкі. На падрыхтоўку паведамлення даецца пэўная колькасць часу. Затым студэнты выступаюць перад сваімі аднагрупнікамі. Па часе выказванне павінна займаць 7-10 хвілін. Ацэньваецца паўната раскрыцця тэмы, правільнасць, лагічнасць, багацце і выразнасць маўлення, адсутнасць арфаэпічных і акцэнталагічных памылак. Студэнты групы могуць задаваць дакладчыку пытанні па тэме выказвання. Лепшыя

паведамленні затым могуць быць рэкамендаваны для ўдзелу ў навуковай студэнцкай канферэнцыі (зразумела, пасля неабходнай дапрацоўкі).

Ва ўсей названай шматстайнасці есць цэнтральны тэхналагічны падыход. Студэнтаў важна нацэліць на тое, што, рыхтуючыся да выступлення, неабходна намеціць асноўны тэзіс, пасля прадумаць (у залежнасці ад жанру) падыход да гэтага сэнсавага вузла выступлення, а потым сфармуляваць высновы, канцоўку. Схема традыцыйная і, з аднаго боку, як бы фармальная, але, бясспрэчна, вуснае слова павінна мець сваю завязку, развіцце думкі, пэўную кульмінацыю і галоўную ідэю, галоўны тэзіс. На аснове галоўнага тэзіса будуецца схема, план выказвання, размяшчэння ўсяго матэрыялу, падбіраюцца прыклады, доказы, назіранні. У гэтым працэсе важна захоўваць прынцып паступовасці, ісці ад больш простага да складанага [Руцкая, 2010, 27.1].

Паспяховае развіцце вуснага маўлення рэалізуецца праз разнастайнасць формаў працы. На сенняшні дзень дамінуючым стаў дзейсны падыход да развіцця маўлення. Ен прадугледжвае, па-першае, узаемадзеянне маральна-эстэтычнага выхавання і маўленчага развіцця; па-другое, выкарыстанне разнастайных метадычных формаў і прыемаў, па-трэцяе, захаванне сістэматычнасці, пераемнасці і практычнай накіраванасці дадзенай працы.

ВЫКАРЫСТАНАЯ ЛІТАРАТУРА

1 Руцкая, А.В. Методыка выкладання беларускай літаратуры: вучэб. дапам. / А.В. Руцкая, М.У. Грынько. — Мінск: Изд-во Гревцова, 2010.

2 Тарасава, С.М. Алімпіядны конкурс "Вуснае выказванне": рэкамендацыі па падрыхтоўцы / С.М Тарасава // Роднае слова. – 2011. – № 1.

3 Рыхтуемся да алімпіяды па беларускай мове і літаратуры : вуснае выказванне / складальнік Д.А. Доўгаль, 2011. – Мінск: Экаперспектива.

**Барановская А.В.**
ГрГМУ (Гродно)

# ВВЕДЕНИЕ ЛЕКСИКИ НА НАЧАЛЬНОМ ЭТАПЕ ОБУЧЕНИЯ

Слова, которые человек использует в своей устной и письменной речевой практике, составляют его активный словарный запас. Чем богаче и разнообразнее словарный запас человека, тем легче пользоваться ему языком.

Без овладения словарным запасом невозможно ни понимание речи других людей, ни выражение собственных мыслей, т.е. лексика нужна как для осуществления продуктивной речевой деятельности (говорения, письма), так и рецептивной (аудирования, чтения).